# 7 ЛІСТАПАДА—56-я ГАДАВІНА ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

# З НАСТУПАЮЧЫМ СВЯТАМ, ТАВАРЫШЫ!

**РАБОТНІКІ ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ! УСЯМЕРНА ПАВЫШАЙЦЕ ЯКАСЦЬ НАВУЧАННЯ, УДАСКАНАЛЬВАЙЦЕ ПАДРЫХТОЎКУ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ! ВЫХОЎВАЙЦЕ ПАДРАСТАЮЧАЕ ПАКАЛЕННЕ Ў ДУХУ КАМУНІСТЫЧНАЙ МАРАЛІ, СВЯДОМЫХ АДНОСІН ДА ВУЧОБЫ І ПРАЦЫ!**

(З Заклікаў ЦК КПСС).

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 32 (165) | Субота, 3 лістапада 1973 г. | Газета выходзіць з верасня 1969 года раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

30 кастрычніка ў актавай зале адбылася III-я агульнаўніверсітэцкая справаздачна-выбарная канферэнцыя. Пярвічныя камсамольскія арганізацыі дэлегатавалі на яе амаль шэсцьсот сваіх лепшых членаў. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі таксама дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедр, партыйныя і камсамольскія работнікі.

Пасля адкрыцця канферэнцыі ўрачыста прагучалі Гімн Саюза СССР і Гімн Беларускай ССР, былі вынесены на сцэну сцяг камсамольскай арганізацыі і памятныя сцягі, заваяваныя камсамольцамі ўніверсітэта ў сацыялістычным спаборніцтве на студэнцкіх будоўлях.

На канферэнцыі са справаздачным дакладам аб рабоце камітэта камсамола ГДУ па выкананню рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XVI з'езда ВЛКСМ і задачах па далейшаму ўдасканальванню камуністычнага выхавання моладзі выступіла сакратар камітэта ЛКСМБ **Тамара Ільянкова.**

Па абмеркаванню справаздачнага даклада выступіла 14 чалавек.

Канферэнцыя прызнала работу камітэта камсамола здавальняючай і прыняла разгорнутую пастанову.

Выбраны новы састаў камітэта камсамола, штаб «Камсамольскага пражэктара» і дэлегаты на раённую камсамольскую канферэнцыю.

У рабоце ўніверсітэцкай камсамольскай канферэнцыі прынялі ўдзел рэктар універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук **Б. В. Бокуць**, сакратар парткома **У. В. Казлоў**, сакратар абкома ЛКСМБ **Валянціна Коўзік**, першы сакратар гаркома камсамола **Аляксей Касцючэнка**, першы сакратар Чыгуначнага райкома камсамола **Пётр Санковіч**.

**Б. В. Бокуць** і **Валянціна Коўзік** выступілі на канферэнцыі.

## НОВЫ САСТАЎ КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

| | | | |
|---|---|---|---|
| Артамонава Л. | Вярцячых С. | Карамышава А. | Нямкевіч І. |
| Астапенка Н. | Гаеў А. | Крус А. | Патапава Р. |
| Афанасенка У. | Голік С. | Крылова Н. | Пінчук А. |
| Бабічаў Я. | Грышанаў А. | Лашкевіч Т. | Пузырын У. |
| Байдун В. | Гуз С. | Лайхтман А. | Рамановіч Л. |
| Бобрык У. | Дзюбо У. | Лялькова Я. | Рамановіч П. |
| Вараб'ёва С. | Ільянкова Т. | Мярэжа В. | Рогаль С. |
| Валяеў У. | Журавель А. | Мурашка М. | Сазаеў У. |
| Ваянец Д. | Касьяненка А. | Насонаў В. | Сасноў А. |
| | | | Старавойтаў М. |
| | | | Стараселец А. |
| | | | Шабан Т. |
| | | | Шаўцоў У. |
| | | | Щэрба А. |

### НОВЫ САСТАЎ ШТАБА «КАМСАМОЛЬСКАГА ПРАЖЭКТАРА»

Агафонаў А. Лайхтман А. Мельнікава Л. Пішчэнка В.
Бандарэнка С. Лялькова Я. Нечыпараў С.

### НА АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ ПЛЕНУМЕ

Членамі новага бюро камітэта ЛКСМБ выбраны **Людміла Артамонава, Яўген Бабічаў, Дзмітрый Ваянец, Уладзімір Дзюбо, Тамара Ільянкова, Таццяна Лашкевіч, Яніна Лялькова, Міхаіл Мурашка, Аляксандр Сасноў Міхаіл Старавойтаў, Уладзімір Шаўцоў.**

Сакратаром камітэта камсамола выбрана **Тамара Ільянкова**, намеснікамі — **Яўген Бабічаў** і **Яніна Лялькова.**

# По запаветах ленінскіх будуй сваё жыццё!

КАМІТЭТ камсамола даваў справаздачу за перыяд са снежня 1971 года. Уся яго дзейнасць, як адзначыла дакладчык, сакратар камітэта ЛКСМБ **Тамара Ільянкова,** была накіравана на выкананне рашэнняў XXIV з'езда КПСС, XVI з'езда ВЛКСМ, паследуючых пастаноў партыі і ўрада, рашэнняў вышэйстаячых камсамольскіх органаў.

Мінулыя два гады былі знамянальныя вялікімі палітычнымі падзеямі. Залаты юбілей нашай Радзімы — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, святкаванне 50-годдзя Ўсесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна, X Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў, падрыхтоўка да святкавання 50-годдзя з дня прысваення камсамолу імя Леніна — вось тыя слаўныя вяхі ў жыцці моладзі нашага ўніверсітэта, усёй краіны.

Яркім сведчаннем вялікай ўвагі і клопатаў партыі і ўрада да студэнцтва з'явіліся Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай адукацыі ў краіне», Усесаюзны і Рэспубліканскі злёты студэнтаў.

За перыяд пасля II-ой справаздачна-выбарнай канферэнцыі ва ўніверсітэце адбыліся значныя змены. Прыкметна павялічылася колькасць студэнтаў стацыянарнага і завочнага навучання, адкрыты новыя спецыяльнасці, узрос аўтарытэт нашай вну, умацаваліся сяброўскія сувязі ўніверсітэта з іншымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі краіны, з моладдзю прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў Гомельшчыны.



З дакладам выступае Тамара Ільянкова

Мы па праву ганарымся тым, што студэнтка чацвёртага курса біёлага-глебавага факультэта Раіса Патапава выбрана дэпутатам абласнога Савета дэпутатаў працоўных, студэнтка чацвёртага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Людміла Артамонава і другакурснік эканамічнага факультэта Аляксандр Грышанаў — дэпутаты гарадскога Савета. Дэпутатам раённага Савета з'яўляецца трэцякурсніца эканамічнага факультэта Люба Рамановіч. У гэтым мы бачым вялікае давер'е нашай моладзі, высокую адзнаку яе працы.

Прыемна гаварыць і аб тым, што на X Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Берліне быў прадстаўнік і камсамольскай арганізацыі нашага ўніверсітэта, Ленінскі стыпендыят, студэнт механіка - матэматычнага факультэта Уладзімір Семянчук.

## ВЫДАТНАЯ ВУЧОБА— ГАЛОЎНЫ ПАКАЗЧЫК

Актыўны ўдзел студэнтаў у выкананні вучэбных праграм, зазначыла ў сваім дакладзе Тамара Ільянкова, вызначае асноўны змест работы камсамольскай арганізацыі. Вучоба—гэта наш працоўны фронт. Студэнцкую пяцігодку мы павінны выканаць у тэрмін з добрымі і выдатнымі адзнакамі.

Камсамольская арганізацыя імкнулася выхоўваць у студэнтаў свядомы падыход да навуковай работы, змагалася з павярхоўным засваеннем матэрыялаў, з нецярплівасцю адносілася да фактаў недобрасумленных адносін асобных студэнтаў к вучобе.

У гэтым кірунку вынікі ўсёй работы падводзіць сесія. Параўнаем паспяховасць студэнтаў за летнія экзаменацыйныя сесіі. У 1971 годзе яна складала 92,7, у 1972—95,5, у 1973 — 94,7 працэнта. Стала больш студэнтаў, якія вучацца толькі на «выдатна». За прыведзеныя гады такіх было адпаведна 210, 325 і 329 чалавек. Нездавальняючыя ж адзнакі мелі 182, 104 і 162 студэнты. За параўноўваемыя тры гады назіраецца рост паспяваючых на «добра» і «выдатна». У 1971 годзе такіх было 845 студэнтаў, у 1972—1091, у 1973—1309.

(Працяг на 2-й стар.).

## КІРАВАЦЬ УМЕЛА

Пазаўчора ў актавай зале ўніверсітэта адбыўся адкрыты агульнаўніверсітэцкі партыйны сход. Абмеркавана пытанне «Аб мерах па далейшаму паляпшэнню партыйнага кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС». З дакладам выступіў намеснік сакратара парткома дацэнт **Я. А. Семянчук.**

На сходзе па абмяркоўваемаму пытанню выступілі навуковы кіраўнік СНТ прафесар **А. С. Калугін,** старшыня камітэта ДТСААФ **П. У. Жукаў,** член парткома прафесар **У. В. Анічэнка**, сакратар камсамольскага бюро механіка-матэматычнага факультэта **Аляксандр Журавель,** старшыня ўніверсітэцкага журы па правядзенню конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках дацэнт **М. М. Маёраў**, сакратар камітэта камсамола **Тамара Ільянкова,** намеснік дэкана фізічнага факультэта па спорту **Г. І. Варатніцкі,** начальнік штаба працоўных спраў універсітэта студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта **Віктар Вайценок.**

У дакладзе і выступленнях было адзначана ўсё тое станоўчае, што ажыццяўляецца партыйнымі арганізацыямі па дзейснаму кіраўніцтву сваім рэзервам — камсамолам. Разам з гэтым ускрываліся істотныя недахопы, указваліся шляхі іх ухілення.

На сходзе прынята разгорнутая пастанова па далейшаму паляпшэнню партыйнага кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі факультэтаў і ўніверсітэта ў цэлым.

□ □

## НА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫХ СХОДАХ

Ва ўніверсітэце прайшлі справаздачна - выбарныя сходы пярвічных партыйных арганізацый. На іх заслуханы і абмеркаваны справаздачныя даклады, з якімі выступілі: на гісторыка - філалагічным, эканамічным, механіка-матэматычным, біёлага-глебавым, геалагічным факультэтах і фізфаку сакратары партыйных бюро адпаведна **У. В. Анічэнка, Н. В. Волкава, У. Ф. Філіпцоў, Н. С. Кісялёва, В. Г. Герасімаў, Д. М. Жаркоў**, а на фізічным факультэце — намеснік сакратара партбюро **Т. П. Жалонкіна.**

Ва ўсіх пярвічных партарганізацыях выбраны новыя саставы партыйных бюро. Сакратарамі партарганізацый выбраны: на гісторыка-філалагічным факультэце — У. М. Сабаленка, эканамічным — Н. В. Волкава, механіка - матэматычным — У. Ф. Філіпцоў, біёлага-глебавым— С. К. Лапіцкая, геалагічным — В. Г. Герасімаў, фізічным — Т. П. Жалонкіна, на факультэце фізвыхавання — Д. М. Жаркоў.

У рабоце справаздачна-выбарных сходаў прымалі ўдзел і выступалі рэктар універсітэта **Б. В. Бокуць** і сакратар парткома **У. В. Казлоў**.

□ □

### ДА ЎВАГІ КАМУНІСТАЎ

**12 лістапада ў актавай зале пачнецца агульнаўніверсітэцкі справаздачна-выбарны партыйны сход.**

**Пачатак — у 17 гадзін.**

# БУДУЙ СВАЁ ЖЫЦЦЁ!

*Са справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).

Аб нашых дасягненнях сведчыць першае месца, занятае ў вобласці па абаронна-масавай рабоце, і другое месца ў рэспубліцы, прысуджанае ўніверсітэту за ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі.

Камсамольцы ГДУ павінны яшчэ больш актыўна праводзіць агітацыйную работу сярод моладзі, сістэматычна выпускаць насценгазеты, матэрыялы якіх прысвячаюць знамянальным датам у жыцці нашай дзяржавы, партыі, ВЛКСМ.

Камітэт камсамола шмат клапаціўся аб наладжванні культурнага адпачынку студэнтаў, арганізацыі мастацкай самадзейнасці. Толькі за мінулы навучальны год праведзена 15 агульнаўніверсітэцкіх вечароў адпачынку. Перад студэнтамі выступалі з канцэртамі многія вядомыя артысты і творчыя калектывы краіны. Вялікую папулярнасць набылі пасяджэнні КВЗ, конкурсныя вечары факультэтаў, конкурсы «Алё, мы шукаем таленты!», «Ану, першакурснік!» «Дзень мехмата», «Дзень геолага», «Дзень эканаміста» і іншыя.

Мінула два гады, як ва ўніверсітэце арганізаваўся вакальна-інструментальны ансамбль «Радзімічы». За гэты час прыкметна вырасла яго выканаўчае майстэрства, ансамбль заваяваў у гледачоў вялікую папулярнасць. З поспехам выступае і танцавальны калектыў.

Між тым, цяпер яшчэ нельга не сказаць пра малалікасць калектываў мастацкай самадзейнасці, пра тое, што асобныя з іх выступаюць ад выпадку да выпадку. Не перавяліся яшчэ і такія «аматары самадзейнасці», якія выступаюць у канцэртах да таго часу, пакуль не атрымаюць месца ў інтэрнаце або пакуль ім не прызначаць стыпендыю.

Трэба адзначыць, што асобныя культурна-масавыя сектары амаль не цікавяцца наведваннем студэнтамі гурткоў мастацкай самадзейнасці. Горш таго, камсамольскія бюро біёлага-глебавага, геалагічнага факультэтаў і фізфака лічаць мастацкую самадзейнасць справай другараднай. Яны займаюцца ёй толькі тады, калі патрэбна выступіць у аглядзе-конкурсе. І тады пускаюцца ў ход усе сродкі. Студэнты прапускаюць заняткі, дзень і ноч рэпетыруюць. Толькі карысць ад гэтага невялікая. Трэба вучыцца ў студэнтаў механіка-матэматычнага, фізічнага і эканамічнага факультэтаў, дзе пастаянна клапоцяцца аб развіцці мастацкай самадзейнасці. Тут створаны і паспяхова выступаюць агітбрыгады

## Яны выступалі на канферэнцыі



На геалагічным факультэце шмат увагі ўдзяляецца здачы норм новага комплекса ГПА. Аб яго ўкараненні ў жыццё расказаў Уладзімір Афанасенка.



Аб лепшай групе біёлага-глебавага факультэта гаварыла студэнтка чацвёртага курса член прафкома Тамара Косарава.



Цікавымі ўражаннямі пра Сусветны фестываль студэнтаў і моладзі ў Берліне падзяліўся выпускнік механіка-матэматычнага факультэта Уладзімір Семянчук.

## З КЛОПАТАМІ АБ БУДУЧАЙ ЗМЕНЕ

Камсамольцы нашага ўніверсітэта, як і ўсёй краіны, выконваюць ганаровае і важнае даручэнне партыі па кіраўніцтву піянерскай арганізацыяй. На ІІ-й справаздачна-выбарнай канферэнцыі, прыпамінала дакладчык Тамара Ільянкова, нас крытыкавалі за недастатковую пастаноўку шэфскай работы. Камітэт камсамола зрабіў патрэбныя вывады з крытыкі і разглядае шэфскую работу як адну з галоўных у дзейнасці арганізацыі. Яна праводзіцца не толькі ў школах. Камсамольцы ўніверсітэта актыўна працуюць у дзіцячым пакоі міліцыі, у домаупрауленнях, дзіцячай спартыўнай школе, створанай пры ГДУ, шэфствуюць над дзіцячым домам, арганізоўваюць сумесна са школамі цікавыя сустрэчы, канцэрты. Паспяхова працуюць школы «Юны фізік», «Юны матэматык», «Юны біёлаг», «Юны хімік». Устаноўлена цесная сувязь факультэтаў са спецыялізаванымі школамі. Летам «цяжкія» падлеткі прыцягваліся да ўдзелу ў трэцім працоўным семестры.

На канферэнцыі аб рабоце дзіцячага пакою міліцыі падрабязна расказвала студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта **Валянціна Якаўлева.**

— Галоўнае ў нашай грамадскай дзейнасці, — зазначыла Валянціна, — гэта выхаваўчы бок справы.

Якаўлева назвала прозвішчы студэнтаў Уладзіміра Папасёмава, Мікалая Новікава, Мікалая Каржова, Вольгі Караленка і іншых рабят, якія рэгулярна выкрайваюць гадзіну-другую і з вялікай адказнасцю за камсамольскае даручэнне аддаюцца дзецям.

Сёлета ва ўніверсітэце створаны і плённа працуе педагагічны клуб «Сэрца аддаю дзецям». Яго пасяджэнні пад кіраўніцтвам Таццяны Барадзіной праходзяць вельмі цікава і з вялікай карысцю для будучых педагогаў.

## ГАРТУЙ СЯБЕ Ў ПРАЦЫ

У кожнага, хто ўкладвае часцінку сваёй душы ў агульнанародную справу, узмацняецца пачуццё гаспадара сваёй краіны. Спалучэнне вучобы з практычнай працай ярка праяўляецца ў стварэнні студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Гэта стала выдатнай традыцыяй.

У трэцім, рашаючым годзе дзевятай пяцігодкі камітэт камсамола ўдзяляў максімум увагі падрыхтоўцы і фарміраванню СБА. Гэта дало станоўчыя вынікі. Па ходу падрыхтоўчага перыяду наша камсамольская арганізацыя была прызнана бюро абкомам ЛКСМБ лепшай у вобласці і ўзнагароджана пераходным вымпелам.

На ўдарных камсамольскіх будоўлях удзельнічала 26 будаўнічых атрадаў ГДУ. Сярод іх зарадзілася каштоўнае патрыятычнае пачынанне — «Адпрацаваць адзін дзень у фонд горада Гагарына».

У сёлетнім працоўным семестры ўніверсітэцкія атрады дабіліся высокіх паказчыкаў, значна перавыканалі ўзятыя сацыялістычныя абавязацельствы. Асвоена 1.025.900 рублёў капіталаўкладанняў. Гэта — дастойны ўклад у датэрміновае выкананне заданняў дзевятай пяцігодкі.

За перыяд студэнцкага працоўнага семестра праведзена вялікая масава-палітычная работа: прачытана 165 лекцый і дакладаў, паказана для сельскіх працаўнікоў 68 канцэртаў, адрамантавана 9 школ, праведзена нямала іншых каштоўных мерапрыемстваў.

Пра падрыхтоўчы перыяд і працу будаўнічых атрадаў універсітэта ў сёлетнім семестры падрабязна расказаў на канферэнцыі камісар штаба працоўных спраў **Віктар Вайцянок.** Ён назваў атрады, якія дабіліся самых высокіх паказчыкаў. Гэта СБА «Амфібія», «Узлёт», «Эканаміст», якія асвоілі адпаведна 143,7, 101,4 і 64 тысячы рублёў.

В. Вайцянок указваў і на тыя недахопы, якія мелі месца ў перыяд падрыхтоўчага цыкла СБА і ў час іх працоўнай дзейнасці. Каб не дапусціць іх у будучым, Віктар прапанаваў, каб у састаў камітэта камсамола ўваходзіў адказны за падрыхтоўку СБА да працоўнага семестра.

## У АКТЫЎНАСЦІ — ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

Аб савецкім студэнцтве праяўляюцца пастаянныя клопаты. Гэта бачна і на прыкладзе нашага ўніверсітэта. З кожным годам паляпшаюцца іх жыллёва-бытавыя ўмовы. 1106 нашых студэнтаў цяпер жыве ў інтэрнатах. У хуткім часе будаўнікі здадуць у эксплуатацыю новы добраўпарадкаваны інтэрнат кватэрнага тыпу. Але ад студэнтаў патрабуецца строгага захавання ўстаноўленага распарадку агульнажыцця, забеспячэння ў інтэрнатах высокай культуры і санітарыі. У вырашэнні гэтых задач важную ролю павінны адыгрываць студсаветы, якія працуюць пад кіраўніцтвам камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый.

На канферэнцыі дэталёва гаварыў пра работу студсавета інтэрната № 1 яго старшыня **Уладзімір Вераб'ёў.** Адначасова са станоўчым ён адзначаў і істотныя недахопы. Яшчэ не ва ўсім поўнасцю задавальняюцца патрэбы студэнтаў. Нездавальняюча працуюць у інтэрнатах буфеты і ўніверсітэцкая сталовая, не заўсёды ёсць спрыяльныя ўмовы студэнтам для пленнай вучобы і г. д.

На канферэнцыі зусім правільна зазначалася, што камітэт камсамола, факультэцкія бюро яшчэ мала ўдзяляюць увагі рабоце ў інтэрнатах. Не заўсёды тут бываюць куратары, прадстаўнікі дэканатаў і кафедр.

У нашым універсітэце ёсць нямала выдатных студэнцкіх груп, якія вызначаюцца ў вучобе і грамадскай дзейнасці. Трэба шырэй абагульняць і прапагандаваць іх вопыт.

— Вытокі поспеху нашай групы, — гаварыла на канферэнцыі студэнтка біёлага-глебавага факультэта **Тамара Косарава,** — у высокай самадысцыпліне, узаемадапамозе, актыўнасці кожнага камсамольца.

З гэтым нельга не пагадзіцца. Сапраўды, там, дзе юнакі і дзяўчаты з неспакойнымі камсамольскімі сэрцамі, з вялікай прагнасцю да ведаў і з гарачым жаданнем да грамадскай дзейнасці, — поспех забяспечаны.

З вялікай увагай было выслухана на канферэнцыі выступленне кожнага камсамольца. Так, Ленінскі стыпендыят студэнт механіка-матэматычнага факультэта **Уладзімір Семянчук** цікава расказаў пра X Сусветны фестываль студэнтаў і моладзі, студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта **Людміла Несцярок** дзялілася вопытам шэфскай работы з піянерскімі арганізацыямі, студэнт біёлага-глебавага факультэта **Міхаіл Бляхер** прысвяціў сваё выступленне пытанню аховы прыроды і ўдзелу ў гэтай высакароднай справе камсамольцаў і моладзі.

Па-ранейшаму не зыходзіць з парадку дня і пытанне аб здачы норм новага комплекса ГПА. Аб яго ўкараненні ў жыццё гаварылі на канферэнцыі выкладчык факультэта фізвыхавання **Уладзімір Болсун** і студэнт геалагічнага факультэта **Уладзімір Афанасенка.**

Характэрнай асаблівасцю III-й справаздачна-выбарнай канферэнцыі з'яўляецца тое, што яна прайшла арганізавана, па-дзелавому, кожнае выступленне было пранікнута клопатам аб дасягненні новых, больш значных поспехаў у вучэбным і выхаваўчым працэсе, а таксама ў шматграннай грамадскай дзейнасці студэнтаў ГДУ.



Дэлегаты канферэнцыі ў час перапынкаў ахвотна набывалі для сябе мастацкую літаратуру, продаж якой быў наладжан ў фае актавай залы.

Фота А. Рудчанкі.

# ВЕРНЫЯ СЛОВУ

25 КАСТРЫЧНІКА ў Палацы чыгуначнікаў імя Леніна адбыўся VII абласны злёт студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Шмат пасланцоў было на ім ад нашага ўніверсітэта.

На злёце са справаздачай аб рабоце СБА выступіў камісар штаба працоўных спраў Віктар Вайцянок. Камісар атрада «Гамяльчанка» Люба Рамановіч расказала пра тое, як працавалі ўніверсітэцкія дзяўчаты на ўборцы ўраджаю гароднiны ў сонечнай Малдавіі.

На злёце адзначана плённая праца студнэцкіх будаўнічых атрадаў нашага ўніверсітэта. Яны з гонарам выканалі сацыялістычныя абавязацельствы — асвоілі 1 мільён 25,9 тысячы рублёў капіталаўкладанняў. Добры след пакінулі байцы СБА на ідэалагічным і культурным франтах па месцу дыслакацыі. У атрадах мацавалася студэнцкая дружба, набываліся працоўныя навыкі.

Па выніках сёлетняга трэцяга, працоўнага семестра Гомельскаму будаўнічаму атраду прысуджана трэцяе ў рэспубліцы месца і тысяча рублёў прэміі. Абласному атраду прысуджан таксама пераходны Чырвоны сцяг ЦК ЛКСМБ.

Важкі ўклад у агульную перамогу ўнеслі студэнты нашага ўніверсітэта. У ліку лепшых адзначаны атрады «Амфібія», «Універсал». Яны ўзнагароджаны чырвонымі сцягамі. Плённая праца атрадаў «Узлёт», «Матэматык», «Альба», «Атлант», «Атланты» адзначана граматамі абкома камсамола і грашовымі прэміямі. А лепшым камандзірам, камісарам і байцам СБА ўручаны каштоўныя падарункі.

Абласны злёт прыняў зварот да ўсіх байцоў Гомельскага абласнога будаўнічага атрада наступнага працоўнага семестра і накіраваў рапарт абкому КП Беларусі і ЦК ЛКСМБ.

У рабоце злёту прынялі ўдзел загадчыкі аддзелаў Гомельскага абкома КПБ Ф. Р. Забродскі, А. М. Брылёў, намеснік старшыні аблвыканкома Л. М. Курчына, другі сакратар гаркома КПБ Б. М. Тамашоў, сакратар аблсаўпрофа С. М. Ліс.

В. СУВІЖЭНКА.

# ЛОЗБЕНЬ Мартын Феафанавіч



30 кастрычніка на 79 годзе жыцця пасля цяжкай хваробы памёр старэйшы выкладчык, дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі нашага ўніверсітэта Мартын Феафанавіч Лозбень.

Мартын Феафанавіч Лозбень аддаў справе народнай асветы больш 50 гадоў. Ён працаваў настаўнікам, загадчыкам школы, у органах народнай асветы, дырэктарам Навукова-даследчага інстытута ў г. Мінску, рэдактарам часопіса «Камуністычнае выхаванне», начальнікам Школьнага Упраўлення НКП БССР.

З 1940 года Мартын Феафанавіч бесперапынна працуе па падрыхтоўцы будучых настаўнікаў, спачатку ў Віцебскім педінстытуце і БДУ імя У. І. Леніна, а з 1944 года — у Гомельскім педінстытуце, а затым ва ўніверсітэце. У гэты перыяд ён выконвае абавязкі дырэктара педінстытута, загадчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі, намесніка дырэктара інстытута па вучэбнай частцы.

М. Ф. Лозбень вёў настойлівую барацьбу за высокую якасць падрыхтоўкі савецкага настаўніка. Ім падрыхтаваны сотні выдатных педагогаў, многія з якіх сталі кіраўнікамі школ, органаў народнай асветы, вучонымі.

Вялікі ўклад унёс Мартын Феафанавіч у работу па павышэнню кваліфікацыі настаўнікаў. Яго лекцыі па пытаннях навучання і выхавання школьнікаў карысталіся велізарнай папулярнасцю ў любой аўдыторыі. Ён з'яўляўся аўтарам шэрагу артыкулаў на педагагічныя і метадычныя тэмы.

М. Ф. Лозбень узнагароджан медалямі «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне» і «За працоўную адзнаку», знакам «Выдатнік народнай асветы», меў шмат падзяк.

Светлая памяць аб Мартыне Феафанавічу Лозбеню будзе заўсёды жыць ва ўдзячных сэрцах яго вучняў.

**Група таварышаў.**

**Рэктарат, партком, мясцовы камітэт і калектыў фізічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку кафедры тэарэтычнай фізікі, кандыдату фізіка-матэматычных навук. Сердзюкову Анатолю Мікалаевічу ў сувязі з заўчаснай смерцю бацькі.**

**Віктар ЯРАЦ.**

## СЦЯГІ СВАБОДЫ

Над планетай,
вятрамі апетай,
палымнеюць Свабоды сцягі,
быццам сэрцы гараць па-над светам
змагароў, што згаралі ў агні.
Колер праўды
вякамі судзілі,
аблівалі вадой і гразёй,
пагражалі — і ў турмы садзілі,
каб не глянуў на свет болей ён.
Але ён — бессмяротны — ўзыходзіў
на счарнелай ад гора зямлі,
разліваўся бясконцым разводдзем,
і сцягі, як праменні, плылі.
Пралятайце, сцягі,
над планетай,
разганяйце дрымотную ціш,
ўрывайцеся
радасным ветрам,
акрыляйце
людзей у жыцці!

## На паэтычнай арбіце

Ніна ПІНЧУК.

* * *

От всего заветного и тихого
Я порою очень далека:
Слишком уж своей неразберихою
Суета-дорога увлекла.
Только лишь на самой светлой станции,
Где в ромашках спрятались дома,
Становлюсь спокойней и внимательней,
Словно затерялась в них сама.
Быстрые минуты незаметные
Пронеслись, и снова я в пути.
В памяти ромашку-грусть заветную
Я с собой стараюсь увезти.

Міхась КАМАРОЎСКІ.

### ДЗЕСЬЦІ ЁСЦЬ...

Дзесьці ёсць прыгожыя
мясціны,
Дзесьці ёсць цудоўныя краі...
Дык чаму ж самотнае ў сіні
Развітанне дораць жураўлі?..
Краю любы, родныя мясціны,
Паабапал сцежак васількі,
Малаком-залітыя нізіны,
У смузе знаёмыя агні.
Каласы шапочуць залатыя,
Лета пахне скошанай травой...
Ці ж забыць мне пра мясціны
тыя,
Дзе я босы бегаў раніцой?!
Можа ёсць прыгожыя мясціны,
Можа й ёсць цудоўныя краі...
Дык чаму ж самотнае ў сіні
Развітанне дораць жураўлі?..

Мікола КРАЎЧАНКА

### ГЕРОЯМ РЕВАЛЮЦЫІ ВЯЛІКАЙ

Героі рэвалюцыі вялікай!
З іх кожны варты помніка ці песні,
Калі адліць іх з бронзы паасобку —
Атрад бы выйшаў на Чырвонай
Прэсні.
Ды толькі не для помнікаў героі,
І не для славы шумнай і двулікай
Ішлі на смерць, на вісельні, у турмы,
А дзеля рэвалюцыі вялікай.
Няхай жыццё іх — шлях метэарыта.
На іх сумленні — пляміны ніводнай
За гэта ўсё адліты назаўсёды
Ім помнік светлай памяці народнай.

**Ніна КАЗЮЛІНА**

* * *

От жизни много мне не надо:
Земля в ладонях, песен свет,
Любимый сердцем человек,
Ушедший от меня давно.
От жизни много мне не надо:
Два острова — мои глаза,
Два лёгких нервных маяка
И сердце доброе одно.
От жизни много мне дано:
Дорог, печалей и страстей
И на душе уже светлей,
Хоть на сердце ещё темно...
От жизни много мне дано.

## ГУЧАЦЬ МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ

**З кожным годам разрастаецца, мацнее і набывае ўсё большую папулярнасць універсітэцкае літаратурнае аб'яднанне. Сёлета ў яго прыйшлі новыя сілы з ліку першакурснікаў.**

**Літаб'яднанне падтрымлівае цесную сувязь з моладдзю нашага горада. Нядаўна пачаткоўцы прысутнічалі і выступалі на вечары, які быў праведзены ў Доме настаўніка і прысвячаўся святу савецкіх педагогаў. Вершы маладых аўтараў былі з цеплынёй сустрэты аўдыторыяй.**

**У мінулую сераду члены літаб'яднання на чале з аспірантам кафедры беларускай літаратуры маладым паэтам Віктарам Ярцам былі гасцямі ў адным з інтэрнатаў завода «Гомсельмаш». Тут нам расказалі пра працу стваральнікаў сельскагаспадарчай тэхнікі, а мы ў сваю чаргу чыталі для гасцінных гаспадароў уласныя творы. Нас падоўгу не адпускалі са сцэны, а на развітанне ва ўдзячнасць дзяўчаты падарылі нам букеты жывых кветак.**

**Алесь ЛОЗКА,**
**старшыня літаратурнага аб'яднання «Росквіт».**

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

# ЗА ПУЦЁЎКУ Ў ФІНАЛ



**Адной з мацнейшых лёгкаатлетак нашага ўніверсітэта з'яўляецца студэнтка факультэта фізічнага выхавання Зінаіда Гразева.**

**На здымку: Зінаіда Гразева.**

На працягу чатырох дзён у спартыўных залах нашага ўніверсітэта і Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту праходзілі занальныя спаборніцтвы на першынство рэспублікі сярод мужчынскіх і жаночых студэнцкіх каманд. У мужчын за дзве пуцёўкі ў фінал змагаліся валейбалісты ГДУ, Гомельскага філіяла БПІ, Мінскага радыётэхнічнага інстытута і інстытута замежных моў, а таксама Віцебскага тэхналагічнага інстытута.

Зладжаную гульню і волю да перамогі прадэманстравалі спартсмены ўніверсітэта. Яны былі мацнейшымі ва ўсіх сустрэчах. Другую пуцёўку ў фінал заваявалі радыётэхнікі.

У жаночым турніры выступала чатыры каманды — ад ГДУ, Гомельскага філіяла БПІ, інстытута фізічнай культуры і Віцебскага медыцынскага інстытута. Найбольшую цікавасць выклікала сустрэча ўладальніц кубка БССР па валейболу — выхаванак ГДУ і валейбалістак ІФК. Гамяльчанкі выступілі ніжэй сваіх магчымасцей і прайгралі з лікам 1:3. Валейбалісткі інстытута фізкультуры дабіліся перамог і ў астатніх сустрэчах. Яны заваявалі першае месца. Не страцілі шансаў на чэмпіёнскі тытул і ўніверсітэцкія дзяўчаты. Хоць ім на гэты раз дасталося другое месца, але яны таксама заваявалі пуцёўку ў фінал.

Б. ПАЎЛОВІЧ.

## НА КУБАК ПА БАСКЕТБОЛУ

Шэсць мужчынскіх і столькі ж жаночых каманд Гомеля аспрэчвалі кубак па баскетболу. Гэтыя спаборніцтвы прысвячаліся 30-годдзю вызвалення Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У фінал здолелі прабіцца сапраўды мацнейшыя. На пляцоўцы — баскетбалісты будаўнічага трэста № 14 і ўніверсітэта. Ад пачатку і да канца гульня праходзіла вельмі напружана і закончылася перамогай студэнтаў з розніцай у 12 ачкоў.

У рашаючай гульні сярод жаночых каманд сустрэліся пастаянныя саперніцы — баскетбалісткі ўніверсітэта і БІЧТу, і ў гэтай сустрэчы перамагла каманда ГДУ.

Кубкі па баскетболу, якія разыгрываюцца лепшымі камандамі горада, зноў атрымалі прапіску ў спартклубе ўніверсітэта.

## МАТЧ ВЕТЭРАНАЎ

На гомельскім стадыёне «Лакаматыў» адбыўся цікавы футбольны матч. Сустракаліся ветэраны Беларускага і Гомельскага дзяржаўных універсітэтаў. У саставе каманды гаспадароў былі дэкан факультэта фізвыхавання дацэнт А. Семікоп, алімпійскі чэмпіён, заслужаны майстар спорту па веславанню Л. Гейштар, майстры спорту А. Чуяшоў, У. Джыоеў, А. Фяськоў і іншыя аматары футбола.

Гонар каманды БДУ на футбольным полі абаранялі тры кандыдаты навук і таксама вядомыя майстры розных відаў спорту.

Першая палавіна гульні праходзіла ў роўнай барацьбе і закончылася безвынікова. У другім тайме ініцыятывай завалодалі мінчане, якія выступалі значна маладзейшым саставам і мелі відавочную перавагу ў хуткасці. Госці здолелі двойчы дабіцца поспеху і атрымалі перамогу з лікам 2:0.

**Наступны нумар нашай газеты выйдзе 17 лістапада г. г.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 32543 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат — 420×300 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 6157.